УДК 908

# СТАН БАРАНАВІЦКІХ СТАРЫХ КАТАЛІЦКА-ЯЎРЭЙКІХ МОГІЛАК. ІНДЭФІКАВАНЫЯ АСОБАЎ, ЯКІЯ ТАМ ПАХАВАНЫЯ

***Ягор Гацко***
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Гродзенскі абласны цэнтр турызму і краязнаўства», Гродна, Беларусь*
igorichg@mail.ru

Дадзены артыкул апісвае гісторыю фармавання могілак г. Баранавічы у 19-пачатку 20 стст. Ідзе апісанне індэфікаваных асобаў, якія там пахаваныя. Артыкул падымае праблему захавання дадзенага некропаля.

Таксама артыкул актуальны тым, што да сённяшняга дня глыбокім даследаваннем каталіцка-яўрэйскімі могілкамі г. Баранавічы ніхто не займаўся.

***Ключавыя словы: могілкі, абеліск, помнік, эпідэмія, ахвяры.***

# CONDITION OF THE OLD CATHOLIC-JEWISH CEMETERY IN THE CITY OF BARANOVICHI. IDENTIFIED PERSONS WHO ARE BURIED THERE

***Yahor W. Hacko***
*State educational institution «Hrodna Regional Center of Tourism and Local History», Grodno, Belarus*

This article describes the history of the formation of the Baranavičy cemetery in 19th and early 20th centuries. The following is a description of the most interesting monuments from an artistic point of view. The article raises the problem of preserving this necropolis.

The article is also relevant due to the fact that until today no one has been engaged in in-depth research of the Catholic-Jewish cemetery of Baranavičy.

***Key words: cemetery, obelisk, monument, epidemic, victims.***

У лістападзе 1871 г. у Навагрудскім павеце Мінскай губерніі каля невялікай вёскі Баранавічы скончваюць будаваць лінію чыгункі Масква-Брэст [19, с. 3]. Дзякуючы чыгунцы, населянны пункт хутка развіваецца, і неўзабаве праз 15 год праз Баранавічы пракладываюць іншую лінію: Вільня-Лунінец-Пінск-Роўна. Насельніцтва мястэчка расце. Сюды на працу на чыгунцы наймаецца шмат людзей з навакольных вёсак і гарадоў. Для працоўных будуецца пасёлак, а за яго мяжой засноўваюцца могілкі [5].

У 1894 г. у паўднёвай частцы мястэчка яе ўладальнік – граф Развадоўскі выдзяляе участак зямлі пад другія могілкі. Па плану яны павінны былі складацца з чатырох канфесійных частак: праваслаўнай, каталіцкай, лютэранскай і іўдзейскай (Малюнак 1). Але з цягам часу лютэранскія могілкі так і не з’явіліся, іўдзейскія былі закладзены ў іншым месцы. З плана рэалізавалася толькі праваслаўная частка. А каталіцкія могілкі ў сваю чаргу з’яўляецца пазней, і недалёка ад праваслаўных [8].

Калі прааналізаваць старыя мапы горада, то можна прыйсці да высновы, што каталіцкія могілкі былі закладзены на мяжы XIX-XX стст. у паўднёвай частцы Баранавічаў каля фальварку Узногі. І на гэтых могілках можна знайсці шмат помнікаў 1910 – 1940-х гг., якія вылучаюцца сваёй мастацкай і архітэктурнай разнастайнасцю. Тут захаваліся помнікі ў стылі эклектыкі і мадэрну. Галоўным матэрыялам для помнікаў з’яўляўся бетон, граніт, пясчанік. Пераважная большасць помнікаў гэтага перыяду падпісана па-польску, невялікая рэшта – па-руску, адзін помнік падпісаны па-нямецку, і адзін на іўрыце. Тут пахаваны прадстаўнікі шматлікіх прафесіяў тагачаснага гораду: адвакаты, інжынеры, лекары, члены рэпатрыяцыйнага лагеру, чыноўнікі, сакратар гімназіі імені Т. Рэйтана, дырэктар Клецкай пачатковай школы, польскія вайскоўцы, паліцыянты, і нават два грамадзяніна ЗША. Знайшлі свой вечны спачын і ахвяры нацыскага лагеру смерці ў в. Калдычэва. 269 помнікаў гэтага перыяду былі аўтарам індафікаваныя, зафіксаваныя і нанесеныя на электронную мапу [16]. Але аб усім па парадку.

У паўночнай частцы могілак мы можам знайці высокі абеліск. Ён прысвечаны памерлым супрацоўнікам рэпатрыяцыйнага лагеру, і нагадвае нам аб трагічных падзеях, якія адбываліся ў горадзе ў пачатку 1920-х гг.

У той перыяд Баранавічы ўжо знаходзіліся ў складзе Навагрудскага ваяводства Польскай рэспублікі. Адным з першых выпрабаванняў новых уладаў было стварэнне ў Баранавічах аднаго з цэнтраў рэвакуацыі бежанцаў Першай сусветнай вайны [6, с. 128]. Тады праз горад прайшло больш за 350 – 400 тысяч чалавек. Тысячы з іх памерлі ў лагеры рээвакуацыі. Улады вельмі баяліся распаўсюду эпідэмій і розных заразных хвароб, таму імі быў створаны гэты цэнтр па рэавакуацыі. У ім праводзілася рэгістрацыя ўцекачоў. Кожны, хто трапляў сюды, таксама павінен быў прасядзець на карантыне тыдзень.

Уцекачы жылі ў бараках вайсковага гарадка – насупраць Палескага вакзала. Пасля месца хапаць не стала, і бежанцаў перасялілі ў вагоны, што стаялі побач [3, с. 1]. Востра адчувалася адсутнасць медыцынскай дапамогі і шпіталя. Адсутнаць апошняга тлумачылася заняццем вайскоўцамі ўсіх адпаведных памяшканняў, з-за чаго «ані адзін шпіталь дагэтуль не можа быць створаны». Дрэнныя санітарныя ўмовы сталі прычынаю з'яўлення ў лагеры шматлікіх заразных хвароб: сыпны і брушны тыфы, халера, цынга, малярыя, крываўка, гішпанка [7, арк. 6]. Колькасць захварэўшых павышалася ў восень-зіму. Напрыклад, калі ў сакавіку 1921 г. было зафіксавана 408 выпадкаў гішпанкі, то ў траўні лічба зменьшылася да 261. Летам захварэўшых як правіла было меньш, але павышаліся выпадкі дызентэрыі [7, арк. 21, 52, 67]. З усяго ліку ўцекачоў, прапушчаных праз Баранавічы, памерла каля 3 – 4 тысяч чалавек; падчас маразоў штодня памірала 200 – 300 чалавек.

Ахвярамі хваробаў былі не толькі бежанцы, але і супрацоўнікі лагеру. Пасля таго, як эпідэмія пайшла на спад, улады вырашылі ўшанаваць памяць памерлых супрацоўнікаў рэпатрыяцыйнага лагеру. Быў створаны Камітэт адбудовы помніка, у склад якога ўвайшлі: інжынер Неграбецкі, доктар Ліпко, палкоўнік Александровіч і камісар рэпатрыяцыйнага лагеру Пракутоўскі [21, s. 24]. Вынікам працы Камітэта было будаванне вышэйзгаданнага абеліска, якога асвяцілі і ўрачыста адкрылі 20 кастрычніка 1923 г. на каталіцкіх могілках. Кракаўская газета «Nowości illutrowane» у сваім артыкуле «Zginęli – jak żołnerz na posterunku» (Загінулі, як жаўнер на пасту) апісала гэтае мерапрыемства. Аўтар артыкулу паведамляў, што на адкрыцці прысутнічалі жыхары горада і высокія госці: прэм'ер-міністар Польшчы Вінцэнты Вітас, міністр аховы грамадскага здароўя Ежы Буяльскі, навару́дскі ваявода Уладзіслаў Рачкевіч, прадстаўнік Лігі Нацыі палкоўнік Ватсан, капелан Эйсмант, камісар рэпатрыяцыйнага лагеру Пракутоўскі [26, s. 2 – 3]. Спачатку быў выступ інжынера Неграбецкага, пасля яго слова ўзяў палкоўнік Александровіч. А потым адбылася цырымонія ўскладання вянкоў ад ваяводы Рачкевіча і прэм'ера Вітаса [22, s. 9]. Абодва таксама выступалі з прамовай. Што выступоўцы казалі публіцы? Мы не ведаем. Але, хутчэй за ўсё, яны ўсе казалі пра пачуццё абавязку, пра яго выкананне, нягледзячы на смяротную небяспеку. Пра краіну, якой, нягледзячы на ўсе ахвяры, удалося адрадзіцца, выстаяць у нядаўняй вайне, і перамагчы ў бітве з нябачным ворагам – эпідэміяй.

Паводле старых фотаздымкаў помнік прадстаўляў сабой дзевяціметровы абеліск, па перыметры якога былі ўкопаны 12 невялікіх бетонных слупоў на якіх мацаваліся ланцугі. Акружаўся помнік дэкаратыўнымі кустамі, каля якіх былі зробленыя 6 драўлянных лаваў. На верхняй частцы абеліска – выява чатырохканцовага крыжа, а ў ніжэйшай была ўмантаванная шыльда з надпісам па-польску: «Polsko, matko nasza. W służbie twej wierni życie swe oddalismy. Pamięci 182 pracowników etapu repatriacyjnego w Baranowiczach, zmiarłych w latach odrodzenia Ojczyny 1920 - 1923» (Польшча, маці наша. У службе табе верныя мы аддалі свае жыццё. Памяці 182 працаўнікоў рэпатрыяцыйнага этапу ў Баранавічах, памерлых у гады адраджэння Бацькаўшчыны 1920 – 1923). Да нашага часу гэтая шыльда не дайшла, цяпер на помніку умацаваная сціплая шыльдачка на якой па-руску напісана: «Памяти жертв эпидемии 1920 – 1923 гг.». Не захаваліся таксама драўлянныя лавы, дэкаратыўныя кусты. Жалезны ланцуг быў скрадзены, бетонныя слупы пабітыя (парэшткі дзесяці з іх захаваліся) [2] (Малюнак 2, 3).

Сёння каля абеліска можна знайсці захаваўшыяся магілы некаторых супрацоўнікаў рэпатрыяцыйнага лагеру, а менавіта: Сафія Аскерка (1857 або 1858 – 05.02.1922), Канстанцін Дожджык (1899 або 1900 – 22.10.1922), Станіслаў Бушкевіч (1897 або 1898 – 10.01.1922), Юзэф Раманоўскі (1896 або 1897 – 16.01.1922), Канстанцін Выторскі (1892 або 1893 – 02.02.1922) і Міхал Міцкевіч (1900 або 1901 – 08.02.1922).

Цягам паўтара года даследванняў удалося знайсці звесткі на 7 асобаў, пахаваных на гэтых могілках.

Першая індэфікаваная асоба – амерыканец Алексы Франак Учцівэк. Вядома, што ён нарадзіўся ў 1897 г. у Чыкага. Прыкладана ў 1919 г. ён стаў валанцёрам дабрачыннай арганізацыі YMCA (Young Men's Christian Association – Юнацкая хрысціянская асацыяцыя). Гэта арганізацыя матэрыяльна дапамагала людзям, якія пацярпелі ад баявых дзеянняў Першай сусветнай вайны. З-за шчодрую дапамогу, арганізацыю ласкава называлі «Цёця Імця» [23].

У тым жа 1919 г. А. Учцівэк дабраўся да Польшчы разам з арміяй Гэллера у складзе 20-тысячнага польскага кантынгенту – валанцёраў з YMCA, прыбыўшых з ЗША. Удзельнічаў у савецка-польскай вайне [25]. Загінуў на фронце 11 ліпеня 1920 г. [20, s. 929] (Малюнак 4).

Другая асоба – гэта дырэктар Клецкай пачатковай школы Антаніна Лістападская (1875 – 3 сакавіка 1937). З дакументаў стала вядома, што школа, якой яна кіравала, знаходзілася па адрасу: Клецк, вул. 1-ая Татарская (сёння - Пушкіна) [12, арк. 5.]. Станам на 1928 г. школьны інспектарат падзяліў Нясвіжскі павет (у склад якога ўваходзіў Клецк) на раёны «для больш дакладнага выканання дыкрэту аб абавязковым навучанні». А. Лістападская была прызначана кіраўніком Клецкага раёну. Кожны кіраўнік быў «ўпаўнаважаны прымаць меры ў дачынені вінаватых у невыкананні гэтага дыкрэту» [15, арк. 61]. (Малюнак 5, 6). Яе магіла доўгі час стаяла закінутая, парослая кустамі акацыі. Зараз усё пачышчана і адноўлена інскрыпцыя на помніку.

Выпадкова былі знойдзены дакументы на яшчэ аднаго чалавека, які пахаваны на некропалі (Малюнак 6, 7). Гэта нейкі Дамінік Каўрыга (1863 – 1935). У 1928 г. ён падаваў заяву аб прыняцці польскага грамадзянства. З заявы вынікае, што ён нарадзіўся 16 студзеня 1863 г. у вёсцы Бортнікі (сёння – Аляхновіцкі сельсавет, Маладзечанскі р-н, Мінскай вобласці) у сям'і Юзэфа і Міхаліны (у дзявоцтве – Зяневіч) Каўрыгаў. У Дамініка была сям'я: жонка Вікторыя (дачка Юзэфа і Уршулі з Цехановічаў), якая нарадзілася 4 красавіка 1871 г. у в. Грабава (сёння – Бабруйскі р-н, Магілёўскай вобласці). Таксама быў сын Пётр, які нарадзіўся 2 жніўня 1912 г. у Мінску. Станам на 1928 г. сям'я жыла ў Нясвіжу на вул. Альбянскай, 28 (сёння - Дзяржынскага) [4, арк. 46 зв. – 47].

Памёр Д. Каўрыга 8 лютага 1935 г. Чаму яго пахавалі ў Баранавічах, сказаць цяжка. Але дзякуючы гэтым невялікім звесткам паступова ажываецца памяць пра чалавека. Так як помнік зараз выглядае занядбаным і пашкоджаным, магчыма ўдасцца знайсці сваякаў, якія б яго даглядалі.

Невялікія звесткі далі дакументы на доктара Яраслава Валожынскага (1868 – 08.09.1928). Пасля заняцця польскімі войскамі Баранавіч у кастрычніку 1920 г., яго прызначылі на пасаду павятовага доктара. Верагодна, на яго таксама выпаў увесь цяжар працы, калі ў горад прыбывалі рэпатрыянты. Таксама, доктар Валожынскі адказваў за санітарны стан горада [9, арк. 3], [7, арк. 2], [14, арк. 4], [13, арк.6] (Малюнак 9, 10).

Вельмі карысная крыніца інфармацыі – гэта ўспаміны сваякоў памерлага. Аўтару ўдалося наладзіць кантакт з польскімі сваякамі дзьвух асобаў, якія пахаваны на некропалі – гэта Казімір Берасневіч і Стэфан Кучыньскі.

Казімір Берасневіч быў адным з чальцоў-заснавальнікаў Секцыі настаўнікаў працоўнага навучання і малявання, а таксама чальцом Саюза польскіх настаўнікаў усеагульных школаў (арганізацыя, кшталту прафсаюза настаўнікаў).

Нарадзіўся К. Берасневіч 17 студзеня 1895 г. на Падоллі. Скончыў гімназію і аддзел скульптуры ў Акадэміі мастацтваў у Хельсінкі [24, s. 1]. Пасля заканчыння Акадэміі жыў і працаваў у паўднёваукраінскіх губерніях Расійскай імперыі [27, s. 415]. Але хутка ў Расеі адбываецца рэвалюцыя і грамадзянская вайна. У 1920 г. яму з цяжкасцю ўдаецца выехаць у новаўтвораную Польшчу ў Баранавічы, таму што «прагнуў у далейшым часе паглыбяць свае веды і працаваць сярод сваіх». У гэтым жа годзе ў яго нараджаецца дачка Марыя. У Баранавічах Берасневіч працуе настаўнікам усеагульнай школы, і згодна з некралогам «быў ідэйным настаўнікам і добрым прафсаюзным дзеячом». У 1929 г. Берасневіч скончвае Дзяржаўны рамесны інстытут і стварае ў Баранавічах «Цэнтральную майстэрню ручной працы». Гэта была арганізацыя кшталту арцелі, дзе займаліся рознымі рамеснымі вырабамі (верагодна скульптурай). Адзначалася яго адданасць гэтай арцелі, якую ён называў «школай працы». Па яго ініцыятыве ў тым жа годзе ствараецца школа для пачынаючых рамеснікаў. У якой ён праводзіць дзень і вечар, навучаючы будучых рамеснікаў. Праца была яго стыхіяй, таму не дзіўна, што навучэнцы праводзілі цэлыя вечары ў гэтай школе [24, s. 1]. Як адзначае некралог, ніхто Берасневічу гэтыя дадатковыя заняткі «не залічваў, ніхто яго да іх не заахвочваў, а начальства, калі магло, нават перашкоджвала, але ён рабіў сваю справу і не шкадаваў сілаў, бо ў снах бачыў вялікі дом, пабудаваны моладззю – Працоўны дом моладдзі» [27, s. 415]. Але планам не ўдалося рэалізавацца, бо неўзабаве Казімір Берасневіч хварэе і 4 траўня 1930 г. памірае ад сухотаў. Яго дачка Марыя не надоўга перажыве бацьку, паміраючы, таксама ад сухотаў, у 1934 г. [1].

На сённяшні дзень помнік К. Берасневіча добра захаваўся. Ён прадстаўляе з сябе прастакутную бетонную пліту, якая пакладзена на зямлю. Адзначаецца мастацкім мінімалізмам: у верхняй частцы пліты – выява крыжа, у нізе напісана па-польску: «Kazimierz Bereśniewicz 1895 – 1930». Па перыметру стаяць 4 бетонных слупа, на якіх калісьці вісеў ланцуг (Малюнак).

Што тычыцца Стэфана Кучыньскага, то вядома, што ён нарадзіўся 6 верасня 1882 г. у маёнтку Пенхратава (Падляшша, Польшча) ў сям'і памешчыкаў. У 1903 г. пасля сканчэння сярэдняй школы ў Ломжы, паступае ў Варшаўскі ўніверсітэт, а пазней вычыцца ў Вышэйшым сельскагаспадарчым інстытуце ў Табары (Чэхія), які сконьчвае ў 1907 г. Жэніцца на Ядзвіге Павешшы, і ў 1913 г. купляе маёнтак ў Сестшэні пад Варшавай. Разам з братам жонкі, Баляславам займаецца там жа будоўляў дачных домікаў. Першая сусветная вайна вымушае сям'ю Кучыньскіх эвакувавацца ў Бабруйск. Але брак не вытрымлівае час, і пасля вайны Стэфан разводзіцца з жонкай, і пераязджае ў Навагудскае ваяводства. Тут ён пачынае працаваць павятовым земскім камісарам, спачатку ў Нясвіжы, а з 1 красавіка 1930 г. – у Навагрудку. У сярэдзіне 1920-х гг. ён ажаніўся з Паўлінай Берасневіч (стрыечная сястра Казіміра Берасневіча), якая ў 1926 г. нараджае яму дачку. У 1930-х сям'я Кучыньскіх жыла ў Баранавічах, магчыма ў чыноўніцкай калоніі.

У красавіку 1935 г. Стэфан Кучыньскі выпраўляецца ў камандыроўку ў Варшаву, дзе і памірае ў ноч на 12 красавіка ў гатэлі «Брыстоль» ад інфаркту. Цела перавозяць у Баранавічы, дзе 15 красавіка 1935 г. на каталіцкіх могілках адбываецца пахаванне [1].

На дадзены момант збіраецца інфармацыя яшчэ пра адну асобу – гэта Казімір Зянон Берасневіч (16.12.1857 – 28.09.1938). Пакуль, вядома, што гэты чалавек належыў да шляхецкага роду Берасневічаў герба «Касцеша». Яго продкі вядомы з XVI ст., і валодалі маёнткам Торчыцы ў Навагрудскім павеце [10, с. 258 – 260]

Пахаваны на некропалі і ахвяры Калдычэўскага лагеру смерці. У 1942 г. у в. Калдычэва Баранавіцкага р-н нацыстамі быў абсталяваны канцлагер, у якім змяшчаліся людзі розных нацыянальнасцяў з Баранавічаў, Дзятлава, Слоніма і іншыя населянных пунктаў рэгіёну. З лагеру людзей адпраўлялі ў Асвенцым, Майданэк і на працы ў Нямеччыну [18, с. 26].

Помнікі ахвярам лагеру датуюцца ў асноўным 1944 г. – годам, калі лагер быў ліквідаваны разам са зняволенымі. Помнікі ахвяраў у большасці сваёй прадстаўляюць з сябе металічныя крыжы чорнага колеру. Выключэнне тут складае помнік сям'і Наўраў (Малюнак 11, 12). Ён стылізавана пад груду камянёў якіх пакрывае папірус з імёнамі загінуўшых. На папірусе прымацаваны голуб з распраўленымі крыламі. Выяву птушкі можна інтэрпрытаваць, як гвалтоўна перарванае маладое жыццё, або як надзея на мір. Дарэчы, пра сям'ю Наўраў вядома што яна складалася з 30-гадовага Фелікса і 22-гадовай Анэліі. Паводле ўспамінаў іх дачкі – Яніны Феліксаўны, бацька працаваў дырэктарам мясакамбіната. Ён браў на працу людзей з гета, а потым казаў, што яны нібыта загінулі пры барбардаванні горада. Такім чынам выратаваў шмат чалавек. Трымаў сувязь з партызанскімі атрадамі, забяспечваў іх харчаваннем і медыкаментамі, бо жонка Анэлія працавала ў бальніцы медсястрой.

Неўзабаве Фелікса выдаў сусед, і ў лютым 1944 г. яго арыштавалі немцы. А ў траўні таго ж году чарга дайшла да Анэліі. Абодвух карнікі катавалі і забілі, калі лінія фронту наблізілася да Калдычэва. Яніна Феліксаўна кажа, што магілу бацькі да гэтага дня так і не знайшлі, а маці была апазнаная па доўгім чорным валасам. Яе перапахавалі на баранавіцкіх могілках [17].

Але што тычыцца стану саміх могілак у цэлым, то на сённяшні дзень ён незадавальняючы. На могілках любяць адпачываць маргінальныя асобы. Яны служаць і месцам начлега для людзей без пэўнага месца жыхарства. Нягледзячы на наяўнасць смецціёвага кантэйнера, і тыя і другія, пакідаюць пасля сябе шмат смецця: пластыкавыя і шклянныя бутэлькі з-пад гарэлкі, піва, таннага віна, глогу, пластыкавыя талеркі і відэльцы, недакуркі, ўпакоўкі з-пад чыпсаў, салатаў, сокаў і г.д.

Калі пахаванні савецкага перыяду яшчэ даглядаюцца сваякамі, то помнікі міжваеннага перыяду, як правіла стаяць парослымі маладымі дрэвамі і прадстаўляюць сабой непраходныя зараснікі.  На некаторых помніках, асабліва міжваенных, бачныя сляды вандалізму: адпіляныя чыгунныя крыжы і ланцугі, паваленыя гранітныя крыжы або цалкам магільныя пліты, знішчаныя медальёны. Аўтарам налічаны толькі восем ацалелых медальёнаў з выявамі нябожчыкаў з пахаванняў 1920-х – 1930-х гг. Ва ўсіх астаніх, медальёны або вырваныя, або пашкоджаныя ўдарамі тупым прадметам. Ёсць помнікі, якія расколатыя на невялікія кавалкі. На такі стан рэчаў у баранавіцкім некропалі ўжо звяртала ўвагу мясцовая прэса [11, с. 4].

Безумоўна для захавання старых могілак патрэбны якасны нагляд і аднаўленне. Дамінанту – дзевяціметровы абеліск патрэбна абнавіць афарбоўку, прыбраць лішнія надпісы, і ўнесці ў спіс гісторыка-культурнай каштоўнасці. Таксама, каля помніка пажадана паставіць пару невялікіх сметніц. Так як праз могілкі часта ходзяць людзі, патрэбна іх больш якасна прыбіраць.

На сённяшні момант, старыя каталіцкія-яўрэйскія могілкі з'яўляюцца найбольш захаваўшымся некропалем горада. З цягам часу на многія магілы перастаюць хадзіць сваякі, і яны пачынаюць зарастаць травой ды маладымі дрэвамі, а потым знішчацца часам ды вандаламі. Старыя могілкі заўсёды патрабуюць нагляду і ўходу. Тут шмат што залежыць і ад гарадскіх службаў, і ад мясцовых валанцёраў ды энтузіастаў, пры ўмове, канешне, што яны ўвогуле хочуць захаваць гэты кавалак гісторыі горада.


1. Асабісты архіў Я. Гацко. Інтэрв'ю з Марцінам Бергманам, праведзенае 15 коасавіка 2023 г. на польскай мове.
2. Барановичи. Открытие памятника жертвам эпидемий 1920 – 1923 гг., 1923 г. [Электронный ресурс]. // 1871.by. – 2015. – Режим доступа: https://1871.by/listing/otkrytie-pamyatnika-zhertvam-epidemij-1920-1923-godov/ – Дата доступа: 30.04.2023.
3. Беларускі звон // Страшэнны лёс уцекачоў (Даклад дэлегацыі ад Беларускага Нацыян. Камітэту ў Баранавічы ў справе абследваньня палажэньня ўцекачоў). – 1922. – 13 студзеня. – С. 1.
4. Дакументы аб выдачы пасведчанняў, якія пацвярджаюць польскае грамадзянства // Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (ДАГрВ). – Ф. 541. – Воп. 1. – Сп. 471. – Арк. 46 зв. – 47.
5. История старейшего сохранившегося кладбища в Барановичах [Электронный ресурс]. // 1871.by. – 2018. – Режим доступа: https: //www.intex-press.by/2018/03/15/istoriya-starejshego-sohranivshegosya-kladbishha-v-baranovichah/ – Дата доступа: 30.04.2023.
6. Латышонак, А.Ю. Гісторыя Беларусі ад сярэдзіны XVIII ст. да пачатку XXI ст. / А.Ю. Латышонак, Я. Мірановіч. – Смаленск: Інбелкульт, 2013. – 368 с.
7. Месячныя рапарты баранавіцкага і валожынскага старастаў аб грамадска-палітычным стане Баранавіцкага і Валожынскага паветаў за 1921 г. // Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (ДАГрВ). – Ф. 551. – Воп. 1. – Сп. 85. – Арк. 2, 6, 21, 52, 67.
8. План города Розвадово. 1892 г. [Электронный ресурс]. // 1871.by. – 2015. – Режим доступа: https://1871.by/map/plan-goroda-rozvadovo/ – Дата доступа: 30.04.2023.
9. Рапарт баранавіцкага павятовага старасты аб грамадска-палітычным стане на тэрыторыі павета за лістапад 1920 – студзень 1921 // Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (ДАГрВ). – Ф. 551. – Воп. 1. – Сп. 76. – Арк. 3.
10. Рыбчонак, С. Гербоўнік беларускай шляхты. Т.2 Б. / С. Рыбчонак [і інш.] – Мінск: НАРБ, 2007. – 672 с. іл.
11. Соснина, И. Что увидел журналист на старом кладбище в Барановичах / И. Соснина // Наш край. – 2018. – 17 октября. – С. 4.
12. Спісы бібліятэк, хат-чытальняў, кіёскаў у гарадах: Клецку, Нясвіжы і Клецкай гміны, перапіска з пастарункамі паліцыі і іх наведванні // Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (ДАГрВ). – Ф. 541. – Воп. 1. – Спр. 351. – Арк. 5.
13. Спісы служачых вышэйшай катэгорыі Навагрудскага ваяводства на 21 лістапада 1923 г. // Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (ДАГрВ). – Ф. 551. – Воп. 2. – Спр. 42. – Арк. 6.
14. Спісы служачых прэзідыяльных аддзелаў павятовых староставў Навагрудскага ваяводства за 1921 г. // Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (ДАГрВ). – Ф. 551. – Воп. 2. – Спр. 10. – Арк. 4.
15. Справаздача аб выкананні школьнага бюджэта, спіс аб санітарна-гігіенічнам стане школ і характарыстыка будынкаў, занятых школамі // Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (ДАГрВ). – Ф. 557. – Воп. 1. – Сп. 26. – Арк. 61.
16. Старыя баранавіцкія могілкі (каталіцка-яўрэйскія) [Электроны рэсурс]. – 2022. – Рэжым доступу: https://www.google.com/maps/d/u/0/viewer?mid=1PP1y0YoeF6-kPdfDQAnyyoIibzVuisro&hl=ru&ll=53.11763474399112%2C26.01588766194907&z=18 – Дата доступу: 30.04.2023.
17. Толочко, В. «Куфэрники» и палачи. Кто ответил за трагедию Колдычевского лагеря смерти [Электроны рэсурс] / В. Толочко // Спутник. Беларусь. – 2018. – Режим доступу: https://sputnik.by/20180502/kufehrniki-i-palachi-kto-otvetil-za-tragediyu-koldychevskogo-lagerya-smerti-1035158303.html – Дата доступа: 30.04.2023.
18. Щербаков, С. Барановичи / С.А. Щербаков, А.М. Примшиц. – Минск «Полымя», 1989. – 93 с.

19. Щербаков, С. Барановичи: улицы и переулки города в прошлом и настоящем, 1884 – 2019 гг. / С.А. Щербаков. – Барановичи: Издатель Хохол Е.Г., 2019 – 140 с.
20. Lista strat Wojska Polskiego. Polegli i zmarli w wojnach 1918-1920. – Warszawa: Wojskowe biuro historyczne, 1934. – S. 929.
21. Pomnik ofiar epidemji w Baranowiczach // Świat. – 1923. – 27 października. – S. 24.
22. Poświęcienie pomnika ofiar epidemji w Baranowiczach // Świat. – 1923. – 3 listopada. – S. 9.
23. Proskień M. Grób wojenny [Электроны рэсурс] / M. Proskień // Olsztyńska strona rowerowa. – 2011. – Рэжым доступу: https://www.rowery.olsztyn.pl/wiki/miejsca/1920/bialorus/brzeski/baranowicze – Дата доступу: 30.04.2023.
24. Ś.P. Kazimierz Bereśniewicz // Roboty ręczne i rysunki. Dwumiesięcznik. – 1930. – maj-czerwiec. – S. 1.
25. W Baranowiczach odnowiono pomnik na grobie Polaka z Chicago [Электроны рэсурс]. Kresy24.– 2020. – Рэжым доступу: https://kresy24.pl/w-baranowiczach-odnowiono-pomnik-bohaterskiego-polaka-z-chicago/ – Дата доступу: 30.04.2023.
26. Zginęli – jak żołnerz na posterunku // Nowości illutrowane. – 1923. – 3 listopada. – S. 2 – 3.
27. Z żałobnej karty // Głos nauczycielski. – 1930. – 13 czerwca. – S. 415.